**Валянціна Клачковіч**

# “ЛЯЦІ, МАЯ ПЕСНЯ…”

**ВЕРШЫ**

**Кобрын 2018**

ББК 84(Беи=Рус)-5

Ля 97

Клачковіч, В. С.

“Ляці, мая песня…” : вершы / ДУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”, аддзел бібліятэчнага маркетынгу ; склад. А. М. Міхейкіна-Белякова. – Кобрын, 2018. – 52 с.

**“Ляцi, мая песня…”** – першая кнiга вершаў Валянцiны Клачковiч. Вершы розныя па тэматыцы i форме, але iх яднае глыбiня i мудрасць думкi аўтара, пранiкнёны лiрызм, шчырасць, любоў да роднай зямлi i да людзей, заклапочанасць лёсам беларускай мовы.

Кнiга разлiчана на шырокае кола чытачоў.

Кiраўнiк народнага<br>Лiтаратурнага аб’яднання<br>“Белый аист”<br>Людмiла Iванаўна<br>Лазюк

*Ляці, мая песня, ад краю да краю,*
*Ляці, быццам птушку цябе адпускаю…*

## Я

Я умею быть строгой и доброй,
Быть податливою – и твёрдой.
Я могу быть смиренной и гордой,
Быть весёлой могу и грустить,
Сильной, смелой хотела бы быть,
И понять я могу и простить,
Быть любимой хочу и любить.
Только жить я хочу,
Просто жить.

*Февраль 2011*

## Родная мова

Татачка, матулечка, дзіцятка,
Красавік, пялёстак, немаўлятка…
Ах, якія ласкавыя словы
Нашай беларускай роднай мовы!
Як яны душы маёй сугучны
І няма за іх на свеце мілагучней.
Бліскавіца, сонейка, вясёлка
Ясачка, хмурынка, перапёлка
Рыбачка мая ты залатая,
Ну, хіба што прыгажэй бывае?
Як пачуеш – дык душа спявае,

Сэрца шчасцем поўніцца да краю.
Берагчы давайце нашу мову,
Бо яна – само жыццё, жыцця аснова.
Наша памяць, будучыня наша,
І ніяк не можа быць іначай.

*Чэрвень 2011*

***

Ноч. У вёсцы цішыня.
Бы гарбуз жоўты, поўня.
Россып зорак, брэх сабак.
І не спіцца аніяк.

*28 ліпеня 2012*

## Шэры настрой

Пахмурны, шэры дзень. Прадзім’е.
У сэрцы шэрасць. Шэрасць у душы.
Скажы мне слова хоць адно, скажы мне,
Ну, не маўчы, прашу я, не маўчы.
Тваё маўчанне раніць маё сэрца
Мацей за словы, у сотні раз мацней,
Скажы, куды мне ад кахання дзецца,
Скажы, мой любы, як мне жыць далей?
Скажы – “Бывай навек. Цябе я пакідаю.”
Скажы мне нават “Не люблю.”
Вось толькі не маўчы, цябе я заклінаю,
Ну немаўчы, ну не маўчы, малю!
Але – сцяна між намі. Яе я не праушу.
Мяне загубіць не тваё маўчанне,
Мяне тваё загубіць раўнадушша.

# Шкада…

Дні цякуць міма,
Як скрозь пальцы вада.
І як нам шчымліва
Бывае шкада!
Шкада нам гадоў,
Што назад не вярнуцца
Прайшла маладосць –
Не паспеў азірнуцца.
Мінулі гады, галава пасівела,
Я многа чаго ў жыцці не сумела.
Камусьці сказаці не змагла,
Што кахала,
А з кім, можа строгай
Занадта бывала.
Магла і пакрыўдзіць
Каго выпадкова,
І шчырай была, можа
Недастаткова.
І раптам нагоды такой
Ўжо не будзе –
Я шчыра прашу вас:
Даруйце мне, людзі!

*23 снежня 2011*

## Выпадак на вакзале

На вакзале
Мне сустрэлася пара такая:
Ён – на мыліцах,
Ногі яго скруціла, скалечыла
Хвароба цяжкая.
Ды і яна моцна кульгае –
І з рукою ў яе нешта
Не тое,
Але як яна абдымала
Яго тою рукою!
І як пяшчотна, аддана,
У вочы яму глядзела!
Бачучы гэта,
Я заплакаць хацела.
Але тут яна ўсміхнулася
Так шчыра і светла,
Што сэрца маё на хвілінку замерла,
І стала мне зразумела:
Дарэмна я плакаць хацела,
Бо пара гэта – шчаслівая,
Нягледзячы на інвалідства,
І мы павінны ў іх вучыцца
Уменню жыць,
У бядзе не скарыцца!

*2 мая 2012*

## Лета

Лета. Полудзень. Спякота.
Куры млеюць каля плота.
Звялі маміны вяргіні,
Ані хмаркі ў небе сінім,
Злосным цмокам неба дыша,
Ветрык голле не калыша.
Вераб'і, скляваўшы жыта,
Прагна п'юць ваду з карыта,
А вада ў карыце тая –
Ну, амаль што закіпае,
Статак гоняць па дарозе
Ўсе навокал у знямозе.
Ўсе навокал прагне ценю,
Сонца палкія праменні.
Калі ж скончыцца ўсё гэта?!
Полудзень. Спякота. Лета…

*30 ліпеня 2012*

## Маё жыццё

Адвечная тэма, адвечныя словы:
Радзіма, матуля і родная мова.
Пяшчоту і ласку ад роднага краю,
І шчасце, што тут я жыву, адчуваю
Усім сэрцам сваім я аддана табе
У каханні і шчасці, у бядзе і журбе
Куточак мой родны, Радзіма мая,

Табой, як матуляю, узрошчана я.
Пад небам тваім, такім чыстым і светлым
Удыхала я пахі Радзімы з паветрам.
Чаромхавы водар зялёнай вясною,
Марознага ветру халоднай зімою.
Цудоўныя пахі ўсіх красачак улетку,
І пах збажыны на асеннім палетку.
І пах, што ўздымаўся, здаецца да неба,
Пах цёплага, смачнага, свежага хлеба.
Расла і сталела я разам з табою,
Каханне сустрэла аднойчы вясною.
У квецені красак, што сонцам сагрэты,
Вясёлкай растаяла цёплае лета,
Узыйшлі, прараслі ўжо кахання зярняткі
І выраслі дзеці – мае птушаняткі.
І цесна ім стала ў родным гняздзе,
Сваёю дарогаю кожны ідзе.
Настала ўжо восень – пара залатая,
Цудоўныя ўнучкі мае падрастаюць.
Хачу я, каб быў у іх казачны лёс –
Хай свеціць ім шчасце, як сонца з нябёс.
Хай будзе ў іх лепшай за нашую доля,
Бяды і хваробаў не стрэнуць ніколі,
І будуць у іх жыццях адвечныя словы:
Радзіма, матуля і родная мова.

*3 чэрвеня 2012*

***

Як спіцца соладка
У бацькоўскай роднай хаце!
Як быццам у дзяцінства
Ты вярнуўся зноў.
Туды, дзе над калыскаю
Спявала песню маці
Ў свет казачных, чароўных
Светлых сноў.
Туды, дзе сонейка ласкава
Так свяціла,
І дзе найлепшыя твае
Прайшлі гады.
Мой родны, любы кут,
Цябе я не забыла,
І ў сваіх думках
Я з табою назаўжды.

*1 жніўня 2012*

***

Пэўна ў мяне так званы "творчы застой"
Бо на душы – смутак і неспакой,
Бо на душы – самотна і горка,
І рука не бярэцца за пёрка,
Нейкіх думак недадуманых перасыт,
І заядае жыццёвая проза, засмоктвае быт,
І трывога, трывога, бясконцая…

Але як хацела б узляцець да сонца я!
Узляцець, раскінуўшы вольнв крылы,
Свет белы ўбачыць, што сэрцу так мілы.
Агністасцю сонечнай крылы не апаліць,
Прыгажосцю зямной душу наталіць,
І ў шчасце паверыць, у бяссмерце душы
І ляцець, ляцець да зораў,
Згубіцца ў гэтай цішы.
Растварыцца ў бяскоцасці,
З ёю зліцца,
Каб потым хаця б былінкаю
На свет нарадзіцца.
Прарасці скрозь зямлю,
Вырвацца з небыцця,
Каб ізноў адчуць і радасць, і боль,
І невыказнае шчасце жыцця!

*10 верасня 2012*

## Хлеб

Хлеб – галава ўсяму, святое слова,
Бо ён – само жыццё, усяго аснова.
Ён – старажытнасць,
Пах вякоў удыхаю,
“Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі…”
Адразу ўспамінаю.
Хлеб – наша гордасць, наша сіла,
Яго зямелька родная ўзрасціла,
І рукі залатыя чалавека,
Благаславёны будзь, святы наш хлеб,

Навекі!

*30 кастрычніка 2012*

*******

“Усе ў параўнанні пазнаецца”,
Так мудры хтось сказаў аднойчы,
Мы не былі б так сонцу рады,
Каб не спазналі цемрадзь ночы.

## Зімовы лес

Які прыгожы лес зімою!
Які ён казачны, чароўны,
Зіма з нябёсаў ўпала снегам
Йдзе гордым поступам князёўны
Зямлю рукою клапатлівай
Накрыла коўдрай цёплай, белай
І завірухаю імклівай
Па – над зямлёю паляцела.
Ручай – гарэзу мімаходам
Празрыстым крышталём накрыла
Бярозкам тонкім на ўзлеску
Па шалі белай падарыла.
Дубам – дзядам надзела шапкі –
Няхай сагрэюцца старыя!
Зялёным соснам, елкам плацці
У адзіны міг пасерабрыла.
Лятала, пела, варажыла,
Наслала шэрані, туманы,
У казку лес ператварыла,
І ён стаіць зачараваны.

*17 снежня 2012*

## Успамін аб маладосці

Белы свет – як макаў цвет.
Жыццё – як цвіценне.
Абляцела, праляцела
У адно імгененне.
Цвіло жыццё, нібы мак,
Ды пры маладосці,
А цяпер – як той палын,
Гарэніць чагосьці.
Эх, ды каб вярнуць назад,
Мне тыя дзянёчкі –
Было б сэрцайку лягчэй,
Свяціліся б вочкі.
Але дзе там! Усё прайшло,
Згінула, прапала,
Усё мінула, усё сплыло –
Як і не бывала.
Праляцела маладосць –
Валасы сівыя.
Толькі памяць зберагла
Гады маладыя.

*10 студзеня 2013*

## Сіла мастацтва

Іграў армянскі хлопчык на дудуку…
Мелодыі ўсходняй незямныя гукі
Плылі, бруіліся, луналі
Да болю сэрца ўсхвалявалі.
У адзіны міг навокал усё прапала,
А над зямлёю музыка лунала.
І засталася толькі музыка адна,
Яе я чары зведала спаўна.
А музыка гучала, гаварыла,
Ах, што яна са мною сатварыла!
Яна мяне ў свій палон узяла,
Мне падалося – я дагэтуль не жыла…
Шчымела, трапятала сэрца,
Здавалася – вось зараз разарвецца
Ад тых пачуццяў, што як хваля
Душу маю да краю напаўнялі,
А музыкант іграў з закрытымі вачыма,
Маўчаць было ну проста немагчыма.
Хацелася і плакаць, і смяяцца,
Крычаць ад радасці, ад гора захлынацца,
І жыць хацелася – да болю, да трызнення,
Памерці і ўваскрэснуць у адно імгненне…
Ах, што гэта за музыка была!
Мелодыя чароўная плыла…
Душой маёю заўладала без астатку
Яна была канцом усяго – і ўсяго пачаткам.

Я ў гэтых гуках растварылася, прапала,
А музыка гучала і  гучала… *4 студзеня 2013*

## Радзіме

Ты светлы сум мой,
І слязінка на шчацэ
Букет рамонкаў белых у руцэ.
Бярозак шоўкавыя косы,
І ранкам летнім залатыя росы.
Ты – дожджык, цёплы і ласкавы,
На лузе скошаныя травы.
Ты ручаёчак, звонкі і празрысты,
На плоце певень галасісты.
І бусел белы ў небе сінім –
Усё гэта ты, мая Радзіма.
Сцяжынка да бацькоўскай хаты
Той край, што песнямі багаты.
Матулі роднай калыханка
І спеў дзяўчат ў сяле да ранку.
Дзіцячы смех – вясёлы, звонкі,
Усё гэта ты, мая старонка.
Прызнання ў каханні словы –
І мілагучнасць роднай мовы.
Ты лёс мой, светлы і шчаслівы,
Ты для жыцця даеш мне сілы.
Мая Радзіма, край мой родны,
Жыві шчаслiва, вольна, годна.

*10 студзеня 2014*

## Роздум

Жыву…Усё быццам, як і трэба.
Дом, дзеці. Унукі і сям’я.
Але чаму бывае горка?
Чаму сумую часам я?
Чаму душа імкнецца недзе,
Чаму спакою ёй няма?
І хто б адказ на гэта ведаў,
Ды я не ведаю сама!
Жыву… Малюся шчыра Богу.
Эх доля, долечка мая!
Жыцця свайго прайшла дарогу,
Цяпер стаю ля краю я.
Аб чым шкадую? Што чакаю,
Вось тут, на грані, на мяжы,
І што чшчэ ў жыцці спаткаю,
І дзе спакой маёй душы?
Жыву…Гляджу з надзеяй у неба.
Але адказу там няма.
І што рабіць мне з гэтым трэба?
Ды я не ведаю й сама.

*14 ліпеня 2013*

## Асенні сум

Восень зноў заваражыла
Лістападам залатым.

Закружыла, задажджыла,
Уецца ў неба горкі дым.
Жураўліны, развітальны
Поўны суму чуцен звон.
Звон трывожны, звон крыштальны,
Як душу хвалюе ён!
І так хочацца бясконца,
Сум пакінуўшы зямлі,
Узняцца ў неба, уверх да сонца
Там, дзе жураўліны клін.
Праляцець скрозь дождж і хмары,
З вышыні на свет глядзець.
Але ж гэта толькі ў марах,
А без крылаў як узляцець?

*2 лістапада 2013*

*******

Нам не патрэбны болей словы.
Ты даравацъ мне не гатовы.
Ты адпусціў мяне на волю,
І не сустрэнемся мы болей.
А мне не трэба воля тая,
Другая я цяпер, другая,
Тваёй хачу быць паланянкай
З табою прачынацца ранкам,
З табою засыпаць апоўнач,
Бо свет адным табою поўны.
Жыць без цябе я не жадаю,
Другая я цяпер, другая.
Я волю на палон змяняю,

Бо я ж кахаю, так кахаю!

*9 снежня 2013*

## Успаміны аб юнацтве

Ах, якая ночка сёння, Божа мой!
Абдымі мяне, мой любы, моцнаю рукой.
Прытулі да сэрца, ласкаю сагрэй,
І заззяюць у небе зорачкі ярчэй.
Пахіснецца неба ў нас над галавой
Калі пацалуеш мяне, любы мой.
Часу бег супыніцца, паплыве назад,
І на нас абрынецца дожджык – зарапад.
Сэрца ад пачуццяў вырвецца з грудзей,
Маладзік самлелы ў возера ўпадзе.
Разбягуцца ціха па вадзе кругі,
Лёгка запляскочуць хвалі ў берагі.
А ад успамінаў – вэрхал у галаве.
Басанож мы пойдзем побач па траве.
Усю ночку будзем у туманах блукаць,
І юнацтва сцежку да відна шукаць.
Паспытаем зноўку пацалункаў смак,
Але маладосць нам не вярнуць ніяк.
Ах, якая ж ночка сёння, любы мой,
Я даўно не бачыла ночанькі такой.

*7 чэрвеня 2014*
*фестываль “Сонечны”*

## Я не шкадую…

Я не шкадую ні аб чым…
За ўсё я ўдзячна лёсу й Богу.
За боль, за слёзы ўначы,
І за спакой, і за трывогу.
За шчасце – усё ж яно было,
Ды і за гора, што спаткала,
За ўсё, што мне жыццё дало:
Што ненавідзела, кахала,
Што спадзявалася, жыла
З надзеяй у лепшае і з верай,
Хоць мне адмераў лёс усяго,
Дабра і ліха поўнай мерай.
Я пакланюся да зямлі
Бацькам сваім, старонцы роднай
За тое, што жыццё далі,
Вучылі жыць сумленна, годна.
Я ўдзячна людзям добрым тым,
Што ў жыцці сваім сустрэла.
І каб спачатку ўсё пачаць,
Я б долі іншай не хацела.
А як боль сэрца сціснe зноўку
У час бяссонніцы ўначы,
Шапчу, як клятву, як замову:
“Я не шкадую ні аб чым…”

*12 кастрычніка 2015*

***

Ах, як жа гэты свет мне мілы!
Мой Божа правы, дай мне сілы
Усё з тваіх рук з удзячнасцю прыняць.
Крычаць і плакаць , і спяваць.
І ненавідзець, і смяяцца
Кахаць і верыць, спадзявацца,
У згодзе жыць з сабой і светам
З сумленнем, з Божым запаветам.
І як жыццё пражыць, скажы,
Каб з сэрцам чыстым і душою
Збавіцель, стаць перад табою.
Без апраўданняў, без ілжы,
Стаць ля апошняе мяжы.

*13 чэрвеня 2015*

## Мама

Мама – галоўнае слова ў жыцці.
Радней, даражэй за яе не знайсці.
Яе клічам мы, калі радасць ці боль,
Яе хочам бачыць мы побач з сабой.
Каханне матулі ўвек не старэе,
Яно ў зімовую сцюжу нас грэе,
А летам спякотным дае прахалоду,
Яно – як праменьчык святла ў непагоду.
Яно, быццам сонца нам свеціць заўжды

У бядзе і ў шчасці праз дні і гады.
Яно нам паверыць у сябе памагае,
Нічога мацней за яго не бывае!
Матуля…Усяго даражэй гэта слова,
Яна сваё сэрца аддаць нам гатова.
Яна нам дарue ласку, цяпло,
А без яе і жыцця б не было!

*Сакавік 2014*

## Жыццё маё

Усё ў жыцці маім было,
І боль, і радасць.
Каханне ружаю цвіло,
Палынам – здрада.
Свяціла сонейка ў душы,
І я спявала.
І месяц плыў пры скавышы,
І хмарай сонца закрывала.
Бяда прыходзіла ў дом мой
Нязванай госцяй.
Бывала горка мне парой,
Шкада чагосьці.
Было і шчасце, так, было,
А ле ж так мала…
А я чакала так яго,
Я так чакала!
Усё было, усё прайшло,
Не ўсё збылося.
Жыццё маё… Ці ж ты было,
А можа, толькі мне здалося?

*7 мая 2015*

***

Вясна толькі ледзь усміхнулася
Цудоўнай усмешкай сваёй,
Заплакала зімка халодная
Наўзрыд капяжовай слязой.
Красуня – вясна крочыць весела,
Цяплом саграває зямлю,
Бялізну аблокаў развесіла,
І пазеляніла раллю.
А слёзкі той зімкі- гаротніцы
Бурлівым звіняць ручайком,
І сэрца лагодаю поўніцца
Святло, хараство навакол!
Вясна гаспадынькай рупліваю
Загляне ў кожны куточак,
Пяшчотай сваёй клапатліваю
Сагрэе травінку, лісточак.
Як дзецям любімым матуля
Падорыць усім сваю ласку,
Абдыме, цяплом прыгалубіць,
І свет стане добраю казкай!

*Сакавік 2016*

## Пытанні

Чаму на сэрцы такая пустэча,

Не зразумею ніяк я таго.
Не адбылася наша сустрэча,
Прайшла я міма шчасця свайго.
Прайшла…А было яно побач, блізка,
Здавалася – толькі далонь працягні.
Люляла доля мяне, як у калысцы
Уверх – уніз. Пралятталі дні.
Маю галаву вясна закружыла,
Зачаравала красой незямной.
І я забыла, пра ўсё забыла,
Была я тады такой маладой!
Душа хмялела ад волі, ад сонца,
Ад неба сіні, ад пахаў вясны,
Хацелася жыць і марыць бясконца,
Кахаць, і  сніць чароўныя сны…
Чаму я заўважыць цябе не сумела
Не ўбачыла шчырасць, адданасць тваю
Жыццё, як хвілінка адна праляцела,
Абраў з нас кожны дарогу сваю.
Чаму ж так зараз балюча і сумна,
Чаму зразумець я цябе не змагла?
Можа, была я тады лёгкадумнай,
Ці ганарлівай занадта была?
Чаму так трывожыць мяне мая памяць,
Трывржыць, хвалюе, заснуць не дае,
Навошта, чаму так сталася з намі,
Нашто тая памяць у сэрцы жыве?

*10 чэрвеня 2016*

## Зіма

Ну вось, нарэшце, і зіма
Сняжынкай першаю ўпала.
Зямля даўно яе чакала,
Каб зноў забыцца сном спакойным
Пад белым покрывам шыкоўным,
І мроіць казачныя сны
У чаканні юнае вясны.
А снег ідзе. Павольна, ціха.
Сняжынкі кружацца нясмела,
І вось ужо пані Завіруха
Завaладала светам белым.
Сняжынак лёгкім карагодам
Яна кіруе так умела,
Што замірае ўся прырода
Пад уладарствам пані белай.
Яна спявае песні – казкі
Лясам і рэкам, і азёрам
Лятае, кружыць у снежным вальсе
Гучыць цудоўным, дзіўным хорам.
І будзе панаваць над краем
Яе вяльможнае нянасце
Пакуль на небе зор яскравых
Святло загадкавае згасне.
Ды утаміўшыся, на золку

Прыляжа дзесьці ў закуточку,
І з ветрам скончыўшы гамонку,
Задрэмле ціха зноў да ночы.

*2 лютага 2017*

## Што з намі?

Што з намі сталася, людзі?
Чаму нас сумленне не будзіць,
Чаму так счарсцвелі душы
Загразлі ў ілжы, у раўнадушшы?
Не тою пайшлі мы дарогай,
Забылі пра веру, пра Бога
У палоне дробных амбіцый.
Усіх норм перайшлі граніцы.
Руку брат падняў на брата,
Рвуць цела Зямлі снарады
Зямлю скрывавілі вайною
Нелюдзі з чорнаю душою.
Жорсткасць пануе на свеце,
У дзіцячых дамах нашы дзеці,
Бацькі ў дамах для састарэлых,
І горыч у іх сэрцах збалелых.
Грошы валодаюць светам,
Прадаецца нават сумленне.
Жыццё – гэта толькі імгненне,
Прашу, памятайце аб гэтым!
Спыніцеся, чуеце людзі!
Спыніцеся, покуль не позна,
Другога жыцця ўжо не будзе,
І голас гучыць ужо грозны

Пачуйце, людзі, пачуйце,
Знайдзіце адказ адпаведны.
Зямлю і сябе ўратуйце,
А іначай – наперадзе бездань!

***

Может это было вовсе не со мной?
Закружил нам головы снегопад шальной.
В нашем парке старом много лет назад
Согревал мне сердце ласковый твой взгляд.
Рой снежинок белых – хоровод зимы,
В этой сказке дивной затерялись мы.
До утра бродили, позабыв про всё,
Закружила вьюга жизни колесо.
Годы пролетели – разошлись пути,
Но судьба нам, видно, рядышком идти.
Только вот остался навсегда со мной
Тот далёкий вечер, снегопад шальной.

*Январь 2011*

***

Ты для меня – и тьма, и свет,
Печаль и радость,
Закат, рассвет, горечь и сладость,
Ты для меня – и ночь, и день,
Беда и счастье.
И свет, и тень, погода и ненастье,
Ты явь и сон,
Ты встреча и разлука,
И смех, и стон, и наслаждение, и мука…

Ты для меня – и жизнь, и смерть,
А кто же я тебе? Ответь!

*31 января 2012*

***

Ну, вот и всё. Мой жребий брошен.
Подведены итоги. Сожжены мосты.
И вздох судьбы печален и тревожен.
Разбиты вдрызг надежды и мечты.
Что ж, не дано. Такая видно участь,
Такой расклад, и поворот в судьбе,
И всё ж живу – страдая, злясь и мучась,
Не доверяя иногда самой себе.
А жизнь идёт. Сменяют зиму вёсны,
И в белой пене вновь стоят сады.
А ведь казалось всё легко и просто,
И новый день не предвещал беды.
Но грянул гром. И небо вдруг разверзлось,
И сердце вздрогнуло, и сжалось от тоски,
И счастье, то что было, где – то делось,
И только боль, тупая боль стучит в виски.
Но я ту боль стерплю, я всё преодолею,
Я буду сильной, и назло судьбе
Я никогда и ни о чём не пожалею,
Я буду просто жить, забуду о тебе.

*Август 2013*

***

И что ж там, наверху, случилось?

Опять весна на нас свалилась!
С размаху шлёпнулась на снег,
Поднявшись – удивила всех!
Небрежно платье отряхнула,
Глазами синими сверкнула,
Пошла походкой грациозной
Назло метели, вьюге грозной
Походкой лёгкой и игривой,
Была она такой красивой!
Я в шоке до сих пор, Бог мой!
Весна свалилась ведь зимой!

*1 марта 2016*

*******

А я живу – и не скучаю,
С восторгом каждый день встречаю
Я рада солнцу и дождю
И новый день как чудо жду!
Ведь это счастье – просто жить!
Смеяться, верить и любить!

*Май 2015*

*******

Если бы люди летать умели,
Было б всё проще, на самом деле,
Но, к сожаленью, так не бывает.
Крылья ведь не у всех вырастают!

## Маме

Ночь за окном, и тишина,
И я в тиши ночной одна,
И чистый лист передо мною,
Строка ложится за строкою
Как будто мамина рука
С иглой над гладью рушника.
И рушником, что вышивала,
Меня на жизнь благословляла.
Добру меня ты, мама, научила,
Со мной все беды пополам делила.
Ты приласкать могла лишь взглядом,
Твоя улыбка, мама, мне награда.
Свою любовь ты щедро всем дарила
И Богу за детей своих молилась,
Судьба тебе нелёгкая досталась,
Но ты такой же доброю осталась,
И доброта твоя – безмерна!
Её хватило б на весь мир наверно,
Мамочка любимая, родная!
Перед тобой колени преклоняю,
Обнять хочу натруженные руки,
Что в жизни никогда не знали скуки
Сказать хочу, что я тебя люблю,
Перед тобою в вечном я долгу!

## Настроение

Зима, и скоро Новый Год,
А за окошком беспредел.
Опять холодный дождик льёт,
И Дед Мороз вновь не у дел,
И где – то там в своей стране,
Он в снежной, мягкой спит постели.
Над ним в небесной вышине
Шумят, качаясь, сосны, ели.
Девичий силуэт в окне,
И взгляд её – прекрасный, нежный,
И вздох печальный в тишине.
Зимою этою бесснежной
Ей снова грезится весна,
И спят декабрьские метели,
Грустит Снегурочка одна,
Мечтая снова встретить Леля!

*4 января 2012*

## Письмо подруге

Ну, что тебе сказать, моя подруга?
Слова какие нужные найти?
Не разорвать мне замкнутого круга,
Обратного, наверно, нет пути.

А сердце так отчаянно стучится,
И от волненья слов не нахожу,
А сердце – словно раненая птица,
Я всё тебе, подруга, расскажу.
Свои мечты, тревоги и надежды
Могу доверить лишь тебе одной.
Давай присядем рядышком, как прежде,
Я так хочу, чтоб ты была сейчас со мной!
Ведь ты одна понять меня умеешь,
И поддержать, и добрый дать совет,
Своею добротой меня согреешь,
Тебя дороже никого на свете нет!
Меня обнимешь ласково за плечи
В глаза заглянешь, спросишь: «Как дела?»
И в этот хмурый, серый зимний  вечер
В душе весна как будто расцвела!
Меня ты понимаешь с полуслова,
Нам есть о чём друг другу рассказать.
Моя подруга! Я тебе готова
Частичку сердца своего навек отдать.
И пусть нас расстоянье разделяет,
На расстояньи дружба и видна,
Хоть говорят, что женской дружбы не бывает,
Но я то знаю – есть, ведь есть она!

*Октябрь 2011*

## Вдохновение

Что такое вдохновение?
Это - чувства, это – рвение
Это страсти взрыв нечаянный,

Крик души моей отчаянный.
Это мука, это слёзы,
И несбывшиеся грёзы.
Это счастье непонятное,
Это горе необъятное,
Жизни истины бесспорные –
И стремленья непокорные.
Это встречи, расставания,
Это тайные желания,
Жизни тоненькая нить
И желание творить!

*7 апреля 2016*

## Мой горад

Мой Кобрын, мой горад цудоўны!
Я ганаруся табой.
Ты – быццам сад той чароўны
Расцвіў маладою красой.
Люблю я твой парк старажытны,
І вербы над ціхай ракой,
Дзе шчасце пад небам блакітным,
А ў сэўрцы – цяпло і спакой.
Люблю тваіх вуліц шумлівых
Паслухаць той ранішні звон,
Калі галубоў палахлівых
Узнімае да воблакаў ён.
І людзі твае – залатыя,
Што самі будуюць свій лёс,
І славу тваю, горад родны,

Узносяць да самых нябёс!
Жыві і квітней, горад родны,
Надзея мая і любоў
Куды б ні звярнула дарога,
Да цябе я вяртаюся зноў.
Мой Кобрын, мой горад цудоўны!
Мой лёс, ты заўсёды са мной,
Пад небам краіны свабоднай
Расцвіў ты красой маладой.

*Чэрвень 2011*

## Вясна

Люблю вясеннія дзянёчкі!
Яны хвалююць сэрца мне.
Пралескі адкрываюць вочкі
І шчыра дзівяцца вясне.
І неба сіняе такое,
І сонца ззяе з вышыні
Зямля ўжо дыхае вясною,
Прыйшлі вясны – красуні дні!
Вясна! І сонейка пяшчота
Нас саграває з вышыні.
Сама краса, сама лагода
Пяшчоты тыя прамяні.
Вясна з зямлёю размаўляе
Шумлівым звонам ручаёў.
Вясна! І сэрца замірае –
Яна да нас прыйшла ізноў.

*Сакавік 2011*

***

Нам чужога не патрэбна,
Ані золата, ні срэбра,
Ні алмазаў, ні брыльянтаў,
Аніякіх другіх трантаў.
Ні зямлі чужой, ні хлеба
Нам чужога не патрэбна!
Толькі б мір быў на планеце
Падрасталі б унукі, дзеці.
І жыла краіна наша
Год ад года лепей, крашай,
Сонейка на небе ззяла,
І любоў нас саграва́ла.

*Сакавік 2011*

## Беларускія жанчыны

Беларускія жаночкі
Фору ўсім другім дадуць!
Быццам тыя васілёчкі
На зямлі сваёй цвітуць.
Прыгажосцю незямною
Ва ўсім свеце славяцца,
І мужчынам, безумоўна,
вельмі падабаюцца.

Зграбныя, руплівыя,
Гаспадынькі дбайныя.
Ну, а як спатрэбіцца –
Смелыя, адчайныя.
Нашы жоначкі, сястрычкі,
І дачушкі слаўныя,
Нашы родныя матулькі
І сяброўкі файныя.
Вы – рамоначкі, вяргіні
Кветачкі сапраўдныя.
Нашы мілыя жанчыны!
Мы без вас не можам жыць,
І гатовы вас заўсёды
На руках сваіх насіць.

*8 сакавіка 2011*

## Сумую. Чакаю

Па беламу свету блукаю.
Усюды цябе шукаю.
З кім ты? Дзе ты? Гадаю,
Як на рамонку гадаю.
Шукаю цябе, шукаю,
А ў сэрцы поўна адчаю,
Дайду да мяжы, да краю,
Як жыць без цябе - не ўяўляю…
Какхаю. Кахаю. Кахаю…

*Жнівень 2011*

# Сталіца

Мяне ўразіла сталіца!
Жыцця свайго імклівым рытмам,
Сваімі гмахамі – дамамі
І вечаровымі агнямі.
Скквераў і паркаў прыгажосцю,
У ёй няўлоўнае ёсць штосьці,
Чаго не выкажаш славамі,
І што так дарага нам з вамі.
Мой край, мой Мінск, мая сталіца!
Табою можна ганарыцца,
Ты – лепшы горад на зямлі.
Дзе б мы ні ехалі, ні йшлі,
Сюды нам хочацца вяртацца,
На ўсё жыццё з табой застацца.
Цудоўны горад! Ну і что ж?
Але мой родны, слаўны Кобрын
Мілейшы майму сэрцу ўсё ж!
Мне так тут хораша, так светла,
Такое чыстае паветра
Так лёгка дыхаецца тут,
Мо самы мілы, родны кут!
І толькі тут, так мне здаецца,
Душой сваёй магу сагрэцца.

Няхай зіму змяняюць вёсны,
Няхай праходзяць дні, гады,
Мой горад родны! Маё сэрца
Табе належыць назаўжды.

*20 сакавіка 2011*

## Летні дожджык

Летні дожджычак ласкавы
За акном шапоча.
Шалясціць ціхутка ў травах,
Расказаць штосьці хоча.
Расказаць ён мусіць, хоча
Пра свае клапоты.
Расказаць, як многа ўлетку
У яго работы.
Напаіць вадой жывою
Хоча ён зямельку,
Каб усё вакол квітнела,
Расло памаленьку.
Наліваліся б у полі
Каласы тугія,
І было ў нас хлеба болей,
Сонейка свяціла.
Ды ў лузе на прыволлі
Кветкі расцвіталі,
Каб і вы, мае ўнучкі
Раслі – падрасталі.
І ніхто ў свеце белым
Наш спакой не зрушыў,
І жылі мы вольна, годна,

У роднай Беларусі.

*16 ліпеня 2011*

## Чым пахне лета

Лета пахне свежаю,
Чыстаю вадзіцай.
Што цурчыць, струменіцца
З светлае крыніцы.
Каласамі хлебнымі,
Што растуць у полі,
Лугавымі кветкамі
Пахне на прыволлі.
Пахне свежым сенам,
Цёплым сырадоем,
Які летнім вечарам
Вып’ем мы з табою.
Яблакамі ў садзе,
Пылам на дарозе,
Агуркамі, кропам
Пахне ў агародзе.
Але ўсяго лепей
Пахне сёння ў хаце:
Ах, як пахне хлебам,
Што спякла нам маці!

*18 жніўня 2011*

## Маё шчасце

Ах, як хацелася мне шчасця!
Яно, як быццам, і было.
Але растаяла, прапала,
Прайшло, мінула, адцвіло…
Яно душу маю сагрэла
Адной хвіліначкай – і ўсё.
І – адгарэла, адзвінела,
І адыйшло ў небыццё.
Калі юнацтва праляцела,
Калі, калі жыццё прайшло?
Заўважыш раптам на світанні –
Завеяй скроні замяло.
І надыходзіць ціха восень,
Вясна жыцця ўжо прайшла.
Яе сляды на белым снезе
Завея злая замяла.
І толькі памяць засталася
Аб шчасці, што жыццё дало.
Аб тым далёкім, светлым шчасці,
Яно, як быццам, і было…

*18 жніўня 2011*

## Што такое шчасце

Што такое шчасце,
У маім разуменні?
Гэта сонца яснага
Цёплыя праменні.
Гэта неба чыстае
Над маёй Радзімай,

Ласкавыя рукі
Матулькі любімай.
Татачкі старэнькага
Галава сівая,
Я ўдзячна Богу
Што яшчэ іх маю.
Гэта мае дзеці –
Дачушка, сыночкі.
Маіх унучкаў любых
Радасныя вочкі.
Смех іх бесклапотны,
І такі мне мілы!
Я хачу каб шчасця
Для ўсіх хапіла!

*5 верасня 2011*

## Успамін

Восень. Дождж халодны за акном.
Вецер трэпле валасы рабіны.
Усё былое мне здалося сном,
Лістапад – гарэза ў гэтым вінны!
Панна Восень залатым агнём
Сэрца маё зноўку апаліла,
І душу маю ўзяла ў палон,
І вадой гаючай напаіла.
Абудзіла ў сэрцы светлы сум,
Па шчацэ слязінкай праліласся
Праляцела чарадою дум,
І вясной юнацтва мне здалася.

*16 кастрычніка 2012*

# Мая Беларусь

Птушка шчасця, белы бусел,
горды, смелы, слаўны птах!
У нябёсах Беларусі
Ты лятай, кружы ў вяках,
І на родныя палеткі
Ты вяртайся з года ў год.
Тут так слаўна пахнуць кветкі,
А паветра - нібы мёд!
Тут прасторна думкам светлым
Вабяць вольныя абшары,
Пацалункам лёгкім ветрык
Дакранаецца да твару.
Б'юць празрыстыя крынічкі
Спеў салоўкі на світанні….
Ночкай летняй зоркі-знічкі
Усе выконваюць жаданні.
Сонейка лагодна з'зяе,
Рэчкі чыстыя цякуць.
Людзі тут, у родным краі,
Найдабрэйшыя жывуць.
Беларусь, мая старонка,
Лепей у свеце не знайсці,
Песня шчасця птушкай звонкай

Да высокіх зор ляці!

*17 мая 2017*

# Успаміны гараджанкі

Летні дзень – як шчасце светлы.
Выйдзеш з хаты за сяло –
Сена водар у паветры,
Як даўно гэта было!
Ідзеш знаёмаю сцяжынай
Цераз поле наўпрасткі
З жыта сінімі вачыма
Паглядаюць васількі.
Каласы казычуць рукі,
А пачуцці – цераз край!
Рэха ўдаль разносіць гукі
Радасць у сэрцы – хоць спявай!
Сонейка пяшчота з неба
Так і льецца на зямлю,
Колькі ж слоў, мой краю, трэба
Каб сказаць, як я люблю
Гэты луг, і гэта поле
І да возера сцяжынкі
Дзе палошча ў сіняй хвалі.
Неба воблачкаў прасцінкі.
Дзе бярозка каля гаю –
Ну само замілаванне!
Як дзяўчына маладая

З клёнам – хлопцам на спатканні.
І бусла палёт павольны
Крылаў узмах яго шырокіх.
Разнясецца ў наваколлі
Гімн жыццю – зазыўны клёкат.
Край мой любы, край адзіны,
Я б тут вечна жыць хацела,
Дзе салодкі пах Радзімы
Лечыць і душу, і цела.

*17 мая 2017*

## Дачная гісторыя

На ўскрайку лесу гаспадар руплівы
Апрацаваў кавалачак зямлі.
І пасадзіў тут яблынькі і слівы,
Яны вясной так дружна расцвілі!
Знайшлося месца для гуркоў і бульбы,
І моркаўка расла, і бурачкі,
І зелянелі шчаўе і цыбуля
Ляжалі гарбузы бы парсючкі.
А каб зайцы не нарабілі шкоды –
Ён пудзіла паставіў на градзе.
Знайшоў для сябра капялюшык модны,
Кашулю ярка-жоўтую надзеў.
Так, пудзіла было яму за сябра,
І гаспадар з ім нават размаўляў,
Калі ўтаміўшыся, папрацаваўшы ладна,
Садзіўся побач ды адпачываў.
А вечарам спяшаўся да чыгункі,
Каб не спазніцца часам на цягнік.

І як прыпынкі, ў галаве мільгалі думкі
Вось так, за годом год, міналі дні.
І радавала поле ўраджаем,
І гаспадар быў ураджаю рады.
Але-ўсё ў жыцці людскім бывае
І ён аднойчы не прыйшоў на грады.
Ён не прыйшоў ні сёння, і ні заўтра
Мо з’ехаў дзесь, а можа, занямог…
І засталося пудзіла без сябра,
А грады ціха захапіў мурог.
Ды сябар-пудзіла быў вартаўнік надзейны,
Чакаў гаспадара ён штовясны,
Але падзеўся недзе сябар яго верны
І апусцеў той агарод лясны.
І выраслі бярозкі ды асіны
Там, дзе калісьці бульбачка цвіла
Пазасыхалі яблынькі і слівы,
Сцяжынка да чыгункі зарасла.
І зарасло ўсё травой навокам
Не прабягае нават тут і заяц.
І толькі пудзіла ў той траве высокай
Каторы год гаспадара ўсё чакае.

*20 мая 2017*

*******

Шчасця, долі не шукаю
На чужой старонцы.
Яно тут, у родным краі,
Пад Радзімы сонцам.

Маё шчасце – мае дзеці,
А цяпер – і ўнукі.
Мір, спакой у белым свеце,
Ды матулі рукі.
Зноў спяшаюся дадому
Па вузкай сцяжынцы
Ўсё да болю тут знаёма –
Кожная драбніца.
Таты згорбленыя плечы
Здалёк заўважаю,
І пачуцці ад сустрэчы
Ледзьве утрымаю.
Пабягу яму насустрач
Як калісь ў маленстве
Што нічога не вярнуць ужо
Разумею сэрцам.
Не сустрэне на парозе
Мама, як калісьці,
Бо ўжо крыжык на пагосце
Ды грудок зямліцы.
Не цвітуць парою вешняй
Маміны вяргіні,
І мяне цяпер суцешаць
Толькі ўспаміны.
Быццам птушкі, залатыя
Гады праляцелі,
Мы ўжо немаладыя,
Валасы ссівелі.
Сум на сэрцы невыносны,
Хто ў тым вінаваты?

І ў душу глядзяць, як вочы,
Вокны роднай хаты.

*3 ліпеня 2017*

## Навальніца

Вуркоча ціха гром
Як дзед стары сярдзіты,
І неба за акном
Слязой дажджу наліта
Маланкі вастры нож
Пранізвае зямліцу,
Хоць страшна, але ўсёж
Люблю я навальніцу!
Люблю я назіраць
Яе буянства ноччу,
І немагчыма спаць,
Бо грозна гром грукоча.
Ці хутка, спакваля,
Сваю спрабуе сілу,
І вось ужо зямля
Устрывожана застыла.
І раптам – звар'яцела,
З бязлітаснаю сілай
Маланка дзіды-стрэлы
На землю апусціла.
І свет ускалыхнецца
Ад лютасці стыхіі,
І трэсне, разарвецца
Шоўк неба чорна-сіні.

Як вадаспад, абрыне.
Магутныя струмені
Зямелька станет плынню
Ў адзінае імгненне.
А вецер ашалела
Ірве на часткі хмары,
І месячык збялелы
Ўпадзе, здаецца, зараз.
І дрэвы векавыя
Схіляюцца ў паклоне
І стогнуць, як жывыя,
Ў стыхіі ў палоне.
І доўга яшчэ будзе.
Ўладарыць навальніца.
Ды свой імпэт астудзіць
І перастане зліцца.
І недзе там, высока,
Як у іншым вымярэнні,
Ледзь чутны грому рокат
Заціхне ў аддаленні.
Спакоем свет агорне,
Ўзыйдзе заранiца
Бальзамам жыватворным
Стаў подых навальніцы.
І толькі зоркі-знічкі
Ўстрывожана міргаюць,
Як спелыя сунічкі
Ў прыпол зямлі злятаюць

*1 чэрвеня 2017*

# Мне цябе не хапае…

Мне цябе не хапае
Вясной, калі ўсё ажывае.
Зімою, ў лютую сцюжу,
Цябе не хапае дужа,
І калі лета настане –
Мне цябе не хапае таксама.
А як прыйдзе осенняя слота,
Расцвіце жоўтай кветкай самота.

*18 ліпеня 2017*

***

Ўжо так не будзе, як было раней…
І сэрца ў адчаі і трывозе –
Бо не сустрэне мама на парозе
Ўжо так не будзе, як было раней.
І з кожнаю хвілінай усё ясней,
Няма яе, што ўсіх была радней.
Ўжо так не будзе, як было раней,
І сэрца ў адчаі і трывозе.

***

У гэты жорсткі, неспакойны час
Святла нам і цяпла так не хапае!
Цяпло ніколі лішнім не бывае,
А калі сонейка, нарэшце, і сагрэе нас –

То гэтым, безумоўна, не сагрэцца.
Бо цеплыня патрэбна нам другая,
Якая толькі між людзьмі бывае,
Такая, што з душы ідзе і з сэрца.
Яна нам Богам дадзена спрадвеку,
Каб з цэлым светам ёю падзяліцца.
Бядзе, няпраўдзе, смерці не скарыцца
І быць, і заставацца чалавекам.

*14 мая 2016*

## Мая песня

Ляці, мая песня, ад краю да краю,
Ляці, быццам птушку цябе адпускаю.
Ляці, бо ўжо ў сэрцы маім табе цесна,
І выраслі крылы ў цябе, мая песня.
Імкнешся ты ў неба, да сонца, да зораў,
Да вольных і светлых, нязнаных прастораў.
Ляці ж, узнімайся, набраўшыся сілы,
Край родны ўбачыш, што сэрцу так мілы!
Убачыш Зямлі прыгажосць незямную,
І людзі цябе, мая песня, пачуюць.
Ляці ж, вольна, горда,
Аж да небакраю
Ляці, адпускаю цябе, адпускаю…

*2 жніўня 2013*

# Содержание


Я…….........................................................................….……… 4
Родная мова …………...……………………………..……… 4
Ноч. У вёсцы цішыня …………..............................…… 5
Шэры настрой ………..……………………………….…… 5
Шкада ………………………………………………………….. 6
Выпадак на вакзале ………………………………………… 7
Лета …………………………………………………...……... 8
Маё жыццё ……………………………………………..…… 8
Як спіцца соладка ……………………………………....... 10
Пэўна ў мяне …………..……………………………….... 10
Хлеб …………………………………………………………… 11
“Усе ў параўнанні пазнаецца” ………………………..…. 12
Зімовы лес …………………………………………………… 12
Успамін аб маладосці ……………………………………… 13
Сіла мастацтва ……………………………..……………… 14
Радзіме ……………..…………………………………….…. 15
Роздум …………….………………………………………… 16
Асенні сум ………………………………………………….. 16
Нам не патрэбны болей словы ………………….....…... 17
Успаміны аб юнацтве ……………………………………… 18
Я не шкадую ………………………………………………… 19
Ах, як жа гэты свет мне мілы!……………………………… 20
Мама …………………………………………………………... 20
Жыццё маё ……………………………………….……..... 21
Вясна толькі ледзь усміхнулася ……..………………… 22
Пытанні ……………………………………………………… 22
Зіма ………………………………………………...………. 24
Што з намі? ………………………………………………….. 25
Может это было вовсе не со мной ………………………… 26
Ты для меня ………………………………….......………... 26
Ну, вот и всё ………………………………………………… 27

И что ж там, наверху, случилось? ……………………... 27
А я живу – и не скучаю …………………..……………… 28
Если бы люди летать умели ………………………..……. 28
Маме ………………………………………………....…. 29
Настроение ………………………...………..……….. 30
Письмо подруге ………………………………...….. 30
Вдохновение ……………………………………..... 31
Мой горад ………………………………………… 32
Вясна ……………………………………………… 33
Нам чужога не патрэбна …………………………. 34
Беларускія жанчыны ……………………………….. 34
Сумую. Чакаю ……………………………….…..... 35
Сталіца ……………………………………………… 36
Летні дождждык ……………………………...….. 37
Чым пахне лета ……………………………………. 38
Маё шчасце ………………………………………… 38
Што такое шчасце ………………………………….. 39
Успамін ……………………………………..……….. 40
Мая Беларусь ………………………………...……. 41
Успаміны гараджанкі ……………………………… 42
Дачная гісторыя …………………………………… 43
Шчасця, долі не шукаю …………………..……….. 44
Навальніца ……………………………...………… 46
Мне цябе не хапае ………………………………….. 48
Ўжо так не будзе ………………………………… 48
У гэты жорсткі, неспакойны час ……………………. 48
Мая песня ……………………………..…………….. 49

Літаратурна-мастацкае выданне

Клачковіч Валянціна

Вершы

Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
г. Кобрын, вул. Жукава, 12